**АГА́ТА**, А г а ф 'я, прысвятак. Адзначаўся 18 лютага на Валожыншчыне. У гэты дзень у царкву прыносілі асвячаць хлеб, абкладзены драбочкамі солі. Лічылася, што такі хлеб «памоцны карове», і яго зачэплівалі ёй на рогі, каб не баялася сурокаў. Калі ж здараўся пажар, то хлеб з соллю кідалі ў агонь, каб ён патух, або ў чыстае поле, каб туды скіраваць вецер. Такое павер'е замацоўвалася ў адпаведнай прыказцы: «Соль святой Агаты бароніць ад агню хаты». У гэты дзень, трэці пасля *Грамніц*, звычайна прыглядаліся да надвор'я: калі надаралася цяпло, то больш ужо вялікіх халадоў не прадбачылася.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 390—391.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ